РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**А.А. Трусаў (Мінск)**

# РОЛЯ Л.В. АЛЯКСЕЕВА Ў РАЗВІЦЦІ БЕЛАРУСКАГА КРАЯЗНАЎСТВА

Леанід Васільевіч Аляксееў шмат гадоў працаваў на Беларусі. Тут ён скончыў аспірантуру Інстытута гісторыі АН БССР у 1950 годзе, а перад гэтым з 1948 па 1950 год працаваў у Гродзенскім гісторыка-археалагічным музеі. У 1962—1966 гадах чытаў агульны курс археалогіі ў Магілёўскім педагагічным інстытуце.

Тэмай яго кандыдацкай дысертацыі былі помнікі археалогіі Полацкай зямлі. Шмат гадоў ён праводзіў археалагічныя раскопкі ў Мсціславе. Таксама вывучаў археалагічныя помнікі Браслава і Друцка.

Акрамя непасрэдных археалагічных даследаванняў Л. Аляксееў вывучаў гісторыю археалогіі Беларусі і мясцовае краязнаўства. Гэтай справе ён прысвяціў сваю манаграфію пад рэдакцыяй акадэміка Барыса Рыбакова (які таксама пачаў сваю навуковую кар'еру на Беларусі), якая мае назву «Археология и краеведение Беларуси XVI в. — 30-е годы XX в.» [1].

Гэта кніга прысвечана памяці знакамітага беларускага гісторыка Міколы Улашчыка і выйшла ў свет пры дапамозе Віцебскага абласнога гісторыка-краязнаўчага музея. У прадмове да кнігі Аляксееў выказвае асаблівую падзяку дырэктару музея Кузьменку і мясцоваму краязнаўцу дацэнту Рыўкіну.

Леанід Аляксееў лічыць, што гістарызм як з'ява свядомасці людзей узнік на Беларусі адначасова з летапісаннем у XI — XII стагоддзях. Ён вылучае чатыры этапы краязнаўства на Беларусі: «народны», «магнацкі», «дылетанцкі» і «навуковы».

«Народны» этап самы старажытны, калі самі людзі звяртаюць увагу на помнікі гісторыі. Ранні перыяд гэтага этапа скончыўся ў XVI стагоддзі. Да гэтага часу людзі яшчэ памяталі пра сутнасць і прызначэнне канкрэтных помнікаў археалогіі, такіх як гарадзішчы і курганы. Пазней з'яўляюцца розныя прыгожыя паданні пра пахаванні волатаў, пра «шведскія» ці «французскія» магілы.

Даследчык вылучае народныя паданні пра старажытныя дарогі, дарогі часоў Вітаўта, Альгерда і Баторыя. Людзі цікавіліся помнікамі сваёй гісторыі, не разбуралі іх (асабліва курганы) і ставіліся да іх з павагай.

«Магнацкі» перыяд — гэта позняе сярэдневякоўе (XV — XVIII стагоддзі), калі беларускія магнаты Радзівілы, Сапегі, Валовічы, Храбтовічы і іншыя збіралі ў сваіх палацах і замках унікальныя калекцыі розных артэфактаў.

«Дылетанцкі» перыяд Аляксееў пачынае з XVI стагоддзя, і першым яго прадстаўніком лічыць М. Стрыйкоўскага, які ўпершыню вывучаў помнікі гісторыі і археалогіі на месцы і нават шукаў канкрэтныя месцы даўніх бітваў. Таксама ён вылучае дзейнасць гродзенскага архімандрыта І. Кульчынскага (30-я гады XVIII стагоддзя), які ўпершыню звярнуў увагу на падабенства муроўкі Полацкай Сафіі і Каложскай царквы.

Новую хвалю цікавасці да помнікаў старажытнасці выклікала вайна 1812 года. Гэта дзейнасць Нарбута, гуртка Румянцава ў Гомелі, даследаванні Какрына і Кэппена.

Пачатак «навуковага» перыяду ў краязнаўстве Беларусі прыпадае на 30 — 40-я гады XIX стагоддзя. Заснавальнікамі беларускай археалагічнай навукі былі браты Тышкевічы, якія стварылі ў сваім маёнтку ў Лагойску першы беларускі археалагічны музей. Вялікае значэнне ў развіцці краязнаўства адыгралі мясцовыя губернскія ведамасці, якія ў беларускіх губернях пачалі выходзіць з 1838 года.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У другой палове XIX стагоддзя пасля адмены прыгону з'явіліся мясцовыя краязнаўцы ў розных гарадах Беларусі. Знакавай падзеяй у развіцці краязнаўства і археалогіі на Беларусі быў IX Археалагічны з'езд у Вільні ў 1893 годзе. У гісторыі краязнаўства з'яўляюцца новыя імёны таленавітых даследчыкаў, такіх як Е. Раманаў, А. Сапуноў і Ф. Пакроўскі.

У канцы XIX стагоддзя пачалося антрапалагічнае вывучэнне беларусаў, якое распачаў антраполаг Канстанцін Ікаў. У канцы XIX – пачатку XX стагоддзя была распрацавана методыка краязнаўчых і археалагічных даследаванняў на еўрапейскім узроўні.

Новы этап у развіцці беларускага краязнаўства ў савецкі перыяд Аляксееў пачынае з 1922 года, калі ў Мінску быў створаны Інбелкульт і пры ім Цэнтральнае бюро краязнаўства (з 1923 г.). З 1925 года выходзіць друкаваны орган Інбелкульта часопіс «Наш край», які адлюстроўваў усю вялікую краязнаўчую працу ў БССР. У 1920-х гадах у рэспубліцы ўзнікла група знакамітых даследчыкаў і краязнаўцаў, такіх як А. Ляўданскі, К. Палікарповіч, С. Дубінскі, А. Каваленя, І. Сербаў і іншыя.

Аднак сталінскі курс «Великого перелома» з яго аднабаковай індустрыялізацыяй, гвалтоўнай калектывізацыяй і шырокім наступам на інтэлігенцыю спыніў росквіт беларускага краязнаўства і фактычна знішчыў яго. Уздым самасвядомасці беларуса, як трапна адзначаў Л. Аляксееў, яго захапленне сваёй мовай, гісторыяй і народнай культурай былі абвешчаны «нацдэмаўшчынай». У выніку амаль цалкам спынены гістарычныя даследаванні і значна скараціліся археалагічныя працы. У 1937 годзе шмат даследчыкаў загінула ў сталінскіх засценках.

Адраджэнне краязнаўства і археалогіі пачалося толькі пасля Другой сусветнай вайны, калі пад кіраўніцтвам ацалелага ад арыштаў К. Палікарповіча пачаліся значныя археалагічныя раскопкі стаянак эпохі каменя і бронзы.

Своеасаблівым працягам вышэйзгаданай працы Л. Аляксеева з'яўляецца яго вялікі артыкул «Археология средневекового периода Белоруссии (1950 – 1990)», надрукаваны ў 1998 годзе ў навуковым часопісе «Российская археология» [2].

У пачатку свайго артыкула, надрукаванага пасля развалу СССР, калі Беларусь стала незалежнай краінай, аўтар нагадвае, што высокі ўзровень беларускай археалогіі 1920-х гадоў быў спынены рэпрэсіямі 1930-х. Пасля вайны на Беларусі ацалелі толькі два археолагі – Палікарповіч і Тарасенка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 1949 годзе ў Беларусь з Ленінграда пераязджае археолаг Аляксей Мітрафанаў, які адыграў значную ролю ў выхаванні беларускіх археалагічных кадраў. Першым аспірантам-археолагам Інстытута гісторыі АН БССР быў Леанід Аляксееў (1950 год). Пазней гэту аспірантуру скончылі і паспяхова абаранілі дысертацыі знакамітыя археолагі Эдуард Загарульскі, Георгій Штыхаў, Леанід Побаль, Пётр Лысенка.

Аляксееў паведамляе пра варварскія адносіны мясцовых улад да помнікаў гісторыі і археалогіі. Напрыклад, у 1962 годзе разбурылі Дабравешчанскую царкву XII стагоддзя ў Віцебску, знішчылі дзядзінец старажытнага Мінска, гарнізонны касцёл у Гродне (фара Вітаўта), полацкі Мікалаеўскі сабор і г. д.

Разам з тым Аляксееў адзначае, што ў Беларусі адрадзілася цікавасць мясцовых жыхароў да сваёй гісторыі, якая ахапіла ў першую чаргу вучняў і настаўнікаў сярэдніх школ, якія прымалі актыўны ўдзел у археалагічных раскопках.

Значную ролю ў развіцці краязнаўства адыгралі папулярныя кнігі па гісторыі і археалогіі Э. Загарульскага, Г. Штыхава і іншых археолагаў. У 1965 годзе выйшаў першы падручнік па археалогіі Беларусі, напісаны Э. Загарульскім. У 60-х гадах сталі выходзіць рэпрынтныя выданні, прысвечаныя археалогіі Беларусі, напрыклад, «Древности Белоруссии» (1966, 1969).

Пазней з'явіўся салідны двухтомнік па археалогіі Беларусі «Очерки по археологии Белоруссии» (1970, 1972). Прычым другі том быў цалкам прысвечаны Сярэдневякоўю да XIV стагоддзя. З сярэдзіны 1970-х гадоў штогод выходзяць манаграфіі беларускіх археолагаў як вынік іх кандыдацкіх дысертацый, а таксама папулярныя кнігі і брашуры. Сярод іх Л. Аляксееў вылучае працы Міхася Ткачова «Замкі Беларусі» (1977, 1987).

У 1982 годзе выйшлі тры цікавыя кнігі. Гэта праца Л. Побаля «Древности Белоруссии в музеях Польши» і два зборнікі артыкулаў «Древности Белоруссии и Литвы» і «Киев и западные земли Руси IX – XIII вв.». У 1988 годзе выходзіць манаграфія Генадзя Каханоўскага, прысвечаная археалогіі і гістарычнаму краязнаўству Беларусі ў XVI – XX стагоддзях. Аднак Аляксееў лічыў, што яна мела няўдалую структуру і перакос у бок першай паловы XIX стагоддзя.

У сваёй працы Аляксееў асобна спыняецца на выданні карт археалагічных помнікаў розных эпох і «Збора помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» ў некалькіх тамах.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Пасля атрымання незалежнасці і адмены цэнзуры ў Беларусі ўзніклі новыя гістарычныя часопісы, у тым ліку мясцовыя краязнаўчыя выданні ў Полацку, Гродне, Гомелі, Браславе, Магілёве, Лідзе і іншых гарадах. Актывізавала сваю дзейнасць і рэспубліканскае выдавецтва «Навука і тэхніка». Археолагі аддзела археалогіі Інстытута археалогіі НАН пачынаючы з 1993 года выдаюць «Гістарычна-археалагічны зборнік». Важнай падзеяй у беларускай гістарычнай навуцы было выданне ў 1993 годзе энцыклапедычнага даведніка «Археалогія і нумізматыка Беларусі».

Напрыканцы свайго артыкула Л. Аляксееў адзначае, што беларуская археалогія, фактычна знішчаная ў 1930-х гадах, за апошнія 50 годоў не толькі адрадзілася, але і дасягнула значна большых поспехаў, чым у 20-я гады XX стагоддзя.

Акрамя навуковых манаграфій і артыкулаў, прысвечаных гісторыі беларускага краязнаўства, Леанід Аляксееў надрукаваў некалькі папулярных краязнаўчых кніг, прысвечаных Беларусі.

У 1974 годзе ў Маскве ў серыі турыстычных кніжак кішэннага фармату «Дорога к прекрасному» выйшла праца даследчыка пад назвай «По Западной Двине и Днепру в Белоруссии», якая была накіравана цікаўным вандроўнікам і аматарам гісторыі. Маршрут распрацаваны даследчыкам даволі цікава. Ён пачынаецца з магістралі Масква–Мінск, праходзіць праз Віцебск і Полацк, па шляху «варагаў у грэкі» і знакамітыя «волакі», а потым ідзе да мяжы з Латвіяй і Літвой праз Браслаў, Дрысвяты, Мядзель, Лявонпаль, Опсу, Паставы, Камаі, Лучай і Глыбокае. Другая частка маршруту ідзе ад Віцебска на поўдзень праз Друцк, Магілёў, Мсціслаў і Гомель.

У сваёй кнізе Аляксееў выкарыстаў шмат цікавых ілюстрацый, прычым кнігу ён прысвяціў памяці фатографа-мастака гэтай кнігі Юрыя Васільевіча Нясквернава.

Апісваючы старажытную гісторыю Беларусі, яе гарадоў і мястэчак, Аляксееў быў далёка наперадзе ад публікацый Лаўрэна Абецадарскага і яго вучняў, якія займаліся фальсіфікацыяй беларускай гісторыі.

Прывяду толькі некалькі прыкладаў. Ва ўводзінах Аляксееў піша: «Пасля трох падзелаў Польшчы Кацярынай II (1772, 1793, 1795) Рэч Паспалітая знікла і ўся Беларусь адышла да Расіі. Пачалася раздача захопленых зямель рускім вайсковым дзеячам і фаварытам імператрыцы».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пра апісанні Віцебска аўтар спачатку цытуе апісанні гістарычнай часткі горада Буніным і Паўстоўскім, а потым піша пра рэчаіснасць 1970-х гадоў мінулага стагоддзя. Цытую: «Зараз у Віцебску няма касцёла, дзе слухаў арган Іван Бунін, няма шматлікіх касцёлападобных двухвежавых цэркваў, якія надавалі гораду адметны няруски выгляд, а царква Дабравешчання XII ст., якой па сапраўднаму ганарыліся віцябляне,ператварылася ў друз і руіны».

А так Аляксееў апісвае разбурэнне культурнага пласта полацкага дзядзінца: «Восенню 1996 года ў час зямельных прац, якія рабіліся на полацкім дзядзінцы, каб збудаваць гараж, экскаватар пачаў бурыць нейкія старыя муроўкі зробленыя з плінфы на цамянцы, пакрытыя фрэскамі».

Цікава расказвае Аляксееў і пра горад Мсціслаў, які вывучаў шмат гадоў. Вось як ён апісвае вайну з Масковіяй, якая пачалася у 1654 годзе: «18 ліпеня войскі ваяводы цара Аляксея Міхайлавіча пад камандай князя Трубяцкога абклалі горад. Чатыры дні яны білі на гарадской цытадэлі (замку) з гармат, а на досвітку 22 ліпеня пачаўся штурм». Горад быў захоплены, ушчэнт разбураны, а яго ўмацаванні зраўнялі з зямлёю. І далей: «У час нашых раскопак пад пластом агароднай зямлі было знойдзена велізарнае папялішча, якое адлюстроўвае пагібель горада 22 ліпеня 1654 года: рэшткі дамоў з цудоўнымі кафлянымі печамі, кавалкі магутных чыгунных гарматных ядраў, вялізныя каменныя шары, якія не паспелі скінуць на галовы ворагаў у час штурму гарадскіх умацаванняў і г. д.». Значна пазней мы даведаемся праўду пра гэтую жахлівую для нас вайну з кніжак Міхася Ткачова і Генадзя Сагановіча.

Такім чынам, гэта праца Аляксеева і зараз уяўляе цікавасць для беларускіх краязнаўцаў.

У 1996 годзе ў Мінску на беларускай мове выйшла чарговая краязнаўчая кніга Л. Аляксеева пад рэцэнзіяй Алеся Краўцэвіча, якая мае назву «Гродна і помнікі Панямоння» [4]. Гэту кнігу Аляксееў прысвяціў светлай памяці даследчыка беларускага мінулага і яго помнікаў, натхнёнага змагара за новую Беларусь Міхася Ткачова. У пачатку кнігі Аляксееў трапна адзначае, што беларускі народ склаўся ў глыбокай старажытнасці праз зліццё славянскіх плямёнаў з усходнебалцкімі абарыгенамі. Сваю дзяржаўнасць ён атрымаў упершыню ў XI стагоддзі, а з 1991 года беларусы будуюць сваю новую незалежную дзяржаву.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У першай частцы кнігі гаворка ідзе пра помнікі Гародні і яе наваколля. Аляксееў падрабязна расказвае пра першыя археалагічныя раскопкі Ядкоўскага і Дурчэўскага, якія працягваліся на тэрыторыі Старога замка да 1 верасня 1939 года.

Шматлікія рэчы, знойдзеныя ў замку, доўга ляжалі закінутыя. Да парадку іх прывялі ў 2-й палове 40-х гадоў польскія археолагі Уладзімір і Алена Галубовічы, затым ваўкавыскі археолаг Георгій Пех, а таксама сам Леанід Аляксееў. У 1949 годзе група маскоўскіх археолагаў на чале з Мікалаем Вароніным завяршыла раскопкі, распачатыя польскімі калегамі. У выніку з'явілася кніга М. М. Вароніна «Древнее Гродно». У якасці ілюстрацый Аляксееў выкарыстоўвае архіўныя здымкі 30-х гадоў XX стагоддзя. Некаторыя з іх зроблены Язэпам Ядкоўскім.

Насупраць Старога замка высіцца Новы замак — помнік архітэктуры XVIII стагоддзя. Аляксееў падрабязна апісвае гэты будынак і апавядае, як у ім адбыўся апошні падзел Рэчы Паспалітай у 1795 годзе.

З асаблівай цеплынёй Аляксееў успамінае пра сваё першае знаёмства з Барысаглебскай (Каложскай) царквой: «Распытаўшы дарогу, я выйшаў да Нёмана, стаў падымацца па каменнай выгнутай сцежцы для прыхаджан.

Вакол мяне, і вышэй, і ніжэй у зяляніне цямнелі постаці людзей, якія кіруюцца да храма. Хутка зверху пачалі далятаць шматгалосыя спевы, а за паваротам у вышыні паказаўся сам храм. Я спыніўся перад гэтым відовішчам, і здавалася, кожная плінфа, кожная маёлікавая плітка мігатлівай паверхні паласатай сцяны з непаўторнымі ўзорамі вымаўляе свой асаблівы гук, і ўсе разам яны ствараюць незвычайную гармонію гуку і зрокавага ўспрымання.

А праз месяц... я — заснавальнік фондаў гродзенскага музея — змушаны быў прымаць новы «музейны экспанат» у епіскапа — храм забралі ў вернікаў».

Далей у кнізе гаворка ідзе пра знакамітыя гродзенскія касцёлы і кляштары: езуіцкі (фарны) касцёл, кляштар бернардзінцаў, кляштар брагітак, францысканскі касцёл і кляштар. Цікава апавядае Леанід Аляксееў пра дом Элізы Ажэшкі і яго лёс, а таксама пра гродзенскі гісторыка-археалагічны музей. Асаблівую цікавасць уяўляе аповед пра Нестара Улейчыка, майстра-чырвонадрэўшчыка, які ўсё жыццё працаваў у музеі, зрабіў усе вітрыны і стэнды, а таксама мэблю, стылізаваную пад XVI стагоддзе (па малюнках Язэпа Ядкоўскага).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З ваколіц Гродна Аляксееў спыняецца на гістарычных помніках Свяцка і Індуры.

Другая частка кнігі мае назву «На Росі, Зяльвянцы і Свіслачы». Спачатку ідзе гаворка пра помнікі Ваўкавыска, касцёл Архангела Міхаіла ў в. Гнезна.

Наступная частка кнігі называецца «На правым беразе Нёмана». Тут апісаны помнікі Шчучына, Малога Мажэйкава, славуты храм XVI стагоддзя ў в. Мураванка, замак XIV стагоддзя ў Лідзе і помнікі Іўя.

«Наваградак і ваколіцы» — назва чацвёртага раздзела кнігі. Тут гаворка ідзе пра дзядзінец і вакольны горад, царкву Барыса і Глеба, Міхайлаўскі касцёл, дом-музей Адама Міцкевіча. З ваколіц Навагрудка Аляксееў расказвае пра сядзібу Храптовічаў-Буценскіх у Шчорсах, замак у Любчы, помнікі Усялюба, вёскі Літоўкі і Свіцязь.

Пяты раздзел называецца «Па старажытнай рацэ Шчары». Ён пачынаецца з апісання помнікаў Слоніма. Гэта былое замчышча, дзе быў замак Сапегаў, а потым палац Агінскага з тэатрам і друкарняй, забудова славутай Рыначнай плошчы, будынак краязнаўчага музея, створанага ў 1929 годзе мясцовым гісторыкам Восіпам Старадубскім (а таксама яго падрабязная біяграфія), касцёл Святога Андрэя XVIII стагоддзя, маёнтак Альберцін.

У 10 кіламетрах ад Слоніма знаходзіцца старажытны Жыровіцкі манастыр з яго ўнікальнымі храмамі, корпусам семінарыі, жылым корпусам і гаспадарчымі пабудовамі, а таксама драўлянай Юр'еўскай царквой на могілках за межамі манастыра. Падрабязна разглядае Л. Аляксееў і гісторыю абарончага храма XVI стагоддзя ў в. Сынкавічы. Шмат цікавых фактаў прыводзіць аўтар пры апісанні помнікаў Ружанаў і Косава.

Асобны, шосты раздзел кнігі Аляксееў прысвяціў помнікам радзівілаўскіх гарадоў Нясвіжа і Міра. Акрамя іх тут ідзе гаворка пра такія гістарычныя помнікі, як Сноў, Ішкальдзь і Паланечку. Напрыканцы кнігі змешчаны спіс літаратуры і слоўнік спецыяльных тэрмінаў.

Такім чынам, роля Леаніда Аляксеева ў гісторыі беларускага краязнаўства займае сваё пачэснае месца.

*Літаратура і крыніцы*

1. Алексеев, Л.В. Археология и краеведение Беларуси XVI в. — 30-е годы XX в. / Л.В. Алексеев. — Минск: Беларуская навука, 1996. — 206 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Алексеев, Л.В. Археология средневекового периода в Белоруссии (1950 — 1990 гг.) / Л.В. Алексеев / Л.В. Алексеев // Российская археология. — 1998. — № 3. — С. 176 — 190.
3. Алексеев, Л.В. По Западной Двине и Днепру в Белоруссии / Л.В. Алексеев. — Москва: Искусство, 1974. — 143 с.
4. Аляксееў, Л.В. Гродна і помнікі Панямоння/ Л.В. Алексеев. — Мінск: Беларуская навука, 1996. — 191 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ